УДК 929:745/749(476)"194/20"

# ПРАФЕСАР Р. Ф. ШАУРА: ВУЧОНЫ, ПЕДАГОГ, МАСТАК



*30 жніўня споўнілася 70 гадоў Рыгору Фёдаравічу Шауру, прафесару, доктару мастацтвазнаўства, лаўрэату прэміі Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Рэдакцыя «Весніка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў» і калектыў універсітэта сардэчна віншуе Рыгора Фёдаравіча з юбілеем, жадае моцнага здароўя, далейшых поспехаў на педагагічным, навуковым і творчым шляху.*

Нарадзіўся Рыгор Фёдаравіч Шаура ў 1944 г. на Лепельшчыне. Пасля заканчэння ў 1971 г. мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута імя М. С. Кірава паступіў у аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук. З 1977 г. і да гэтага часу працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. За гэты перыяд ён вырас у вядомага вучонага і педагога. У 1983 г. Р. Ф. Шаура абараніў кандыдацкую, у 2009 г. – доктарскую дысертацыі.

Па ініцыятыве Р. Ф. Шауры з 1990 г. пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па спецыялізацыі «народныя рамёствы», якая карыстаецца вялікім попытам сярод работнікаў сацыякультурнай сферы. Дзякуючы намаганням Рыгора Фёдаравіча ўпершыню ва ўстанове вышэйшай адукацыі Беларусі была створана кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Дзейнасць кафедры пачалася ў поўным сэнсе «з нуля»: не было ні матэрыяльна-тэхнічнай базы, ні адпаведных памяшканняў, ні выкладчыкаў. Аднак за 24 гады існавання кафедры зроблена вельмі і вельмі многа карыснага па арганізацыі навучальнага працэсу. Аб маштабах зробленага можна меркаваць, наведваючы выстаўкі студэнцкіх творчых і дыпломных прац, разглядаючы экспанаты музея дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а лепей зазірнуць у вучэбныя майстэрні ганчарства і керамікі, ткацтва, габелена, батыка, саломапляцення, малюнка, алейнага і акварэльнага жывапісу, каб пабачыць сваімі вачамі вучэбна-творчы працэс.

Вядома, што творчаму чалавеку недастаткова развіваць і ўдасканальваць мастацкія ўменні і веды толькі ў вучэбнай аўдыторыі, таму ў навучальны працэс уключаны пленэры з выездамі ў Мір, Нясвіж, Навагрудак, на Браслаўшчыну, вытворчая і педагагічная практыка, экспедыцыі, паездкі па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычных мясцінах Беларусі, наведванне майстэрняў вядучых беларускіх мастакоў. Гэта ў значнай ступені стымулюе цікавасць студэнтаў да будучай прафесіі, пашырае іх кругагляд і аказвае станоўчы ўплыў на фарміраванне прафесійнай кампетэнцыі.



Р. Ф. Шаура.
Нацюрморт восеньскі (1998)

Сёння кафедра падрыхтавала больш за 700 спецыялістаў для сферы культуры і вырасла ў вучэбна-выхаваўчае і творчае падраздзяленне ўніверсітэта, аб'яднаўшы выкладчыкаў – вядомых мастакоў у галіне выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці, вопытных педагогаў і выхавацеляў.

Асноўнымі задачамі кафедры ў падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне дэкаратыўнага мастацтва і народных рамёстваў з'яўляюцца вывучэнне, засваенне, развіццё і трансляцыя народных традыцый, выхаванне моладзі на лепшых культурных дасягненнях нашай краіны. Непасрэдны кантакт з народнымі майстрамі з мэтай пераемнасці лепшых традыцый дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ажыццяўляецца падчас навуковых экспедыцый, правядзення пленэраў, свят і выставак народнай творчасці. Менавіта традыцыі народных рамёстваў у навучальным працэсе выкарыстоўваюцца як падмурак творчага майстэрства, што ў працэсе далейшай творчай перапрацоўкі спрыяе дасягненню сапраўднага мастацкага ўзроўню.

У апошнія дзесяцігоддзі ў рэспубліцы адкрыты дамы фальклору, цэнтры рамёстваў, школы народнай творчасці, праводзяцца шматлікія фестывалі і святы. Усё гэта накіравана на тое, каб частку сваёй духоўнай спадчыны мы надзейна захавалі і перадалі нашчадкам. Праваднікамі гэтай вельмі важнай і карыснай справы сталі выпускнікі кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Дзякуючы эксперыментальна-творчай працы калектыву кафедры і яе выпускнікоў сёння ў мастацкую культуру вяртаюцца шматлікія, але на жаль страчаныя віды традыцыйнага мастацтва, такія як абварная і задымленая кераміка, саломапляценне, узорнае ткацтва, роспіс тканін і інш. Усё гэта ў значнай ступені абагачае нашу нацыянальную культуру.

Трэба адзначыць, што пад кіраўніцтвам Р. Ф. Шауры калектыў кафедры ажыццяўляе вялікую вучэбна-метадычную дзейнасць. Супрацоўнікамі кафедры распрацаваны і выдадзены комплексна-мэтавыя праграмы, якія забяспечваюць арганізацыю навучальнага працэсу ва ўніверсітэце па новых адукацыйных стандартах. Упершыню ў навучальны працэс уведзены курс «Самадзейнае выяўленчае мастацтва і народная творчасць». Распрацаваны і выкарыстоўваюцца ў вучэбнай практыцы адпаведныя праграмы па дваццаці спецыяльных дысцыплінах мастацкага цыкла, выдадзены вучэб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны дапаможнік «Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі», аўтарам якога з'яўляецца Р. Ф. Шаура. Некалькі раней пабачылі свет яго падручнікі – «Малюнак у навучальным працэсе», «Перспектыва ў малюнку і жывапісе», якія шырока выкарыстоўваюцца ў агульнаадукацыйных і мастацкіх школах рэспублікі і ўстановах вышэйшай адукацыі. Як вучоны і мастацтвазнаўца Р. Ф. Шаура з'яўляецца аўтарам звыш 100 навуковых прац. Акрамя артыкулаў у навуковых зборніках ім апубліканы 7 манаграфій, якія сёння запатрабаваны ў інтэлектуальнай грамадскасці.



Р. Ф. Шаура.
Кастрычніцкі мажор (2000)

Працуючы ва ўніверсітэце на пасадзе загадчыка кафедры 20 гадоў, Рыгор Фёдаравіч стварыў сапраўдную навуковую школу, якая накіравана на падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшага звяна – магістрантаў і аспірантаў, падрыхтаваў шэраг кандыдатаў навук. Значную частку свайго часу ён аддае рэцэнзаванню і апаніраванню кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, абмеркаванню манаграфій і навуковых артыкулаў, выступленням на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях. Узначальваючы навукова-творчую лабараторыю «Традыцыйныя рамёствы беларусаў», Р. Ф. Шаура разам з калегамі-супрацоўнікамі даследуе беларускае традыцыйнае народнае мастацтва, што дае магчымасць пашыраць гарызонты ў айчынным мастацтвазнаўстве, грунтоўна пазнаваць і асэнсоўваць нашу спадчыну.

Дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву кафедрай і педагагічнаму майстэрству выкладчыкаў, студэнты і выпускнікі актыўна ўключаны ў мастацкатворчы працэс. У рэспубліцы пастаянна арганізуюцца выставы вучэбных і творчых работ студэнтаў і выпускнікоў БДУКМ. Толькі за апошні час звыш 40 студэнтаў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сталі лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, пераможцамі свят-конкурсаў у галіне народнага мастацтва як на рэспубліканскім, так і на міжнародным узроўні. Так, на міжнародным конкурсе высокай моды нацыянальнага касцюма (Масква, Мінск) выхаванцы напрамку спецыяльнасці «народныя рамёствы» сталі лаўрэатамі конкурсу, а касцюм «Чароўная пані» – дыпломная праца выпускнікоў кафедры, атрымаў Гран-пры. На Міжнародных Дэльфійскіх гульнях на працягу 2011 і 2012 гг. студэнты кафедры паказвалі высокі ўзровень, а ў 2013 г. атрымалі самую высокую ўзнагароду Дэльфійскіх гульняў – Гран-пры.

Педагагічную і навукова-творчую дзейнасць Рыгор Фёдаравіч Шаура паспяхова спалучае з грамадскай дзейнасцю. На працягу шэрагу гадоў ён з'яўляецца членам рэспубліканскага журы конкурсу народнай творчасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

членам вучонага савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, уваходзіць у склад вучэбна-метадычнага савета па выяўленчым мастацтве Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, прэзідыума Саюза майстроў народнай творчасці, а таксама прымае непасрэдны ўдзел у саветах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Р. Ф. Шаура з'яўляецца сябрам Саюза мастакоў Беларусі. Як мастак-акварэліст ён удзельнік 25 рэспубліканскіх і міжнародных выставак. Працы Рыгора Фёдаравіча знаходзяцца не толькі ў музеях Беларусі, але і ў прыватных калекцыях Італіі, Германіі, Англіі, Нарвегіі і іншых краін Заходняй Еўропы.



Р. Ф. Шаура.
Вечерняя рапсодия (1998)

У адпаведнасці з указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2000 г. Р. Ф. Шаура быў узнагароджаны дыпломам лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне», а ў 2001 г. за выдатныя заслугі ў развіцці вышэйшай школы Рыгор Фёдаравіч атрымаў спецыяльную стыпендыю Прэзідэнта.

На ніве падрыхтоўкі і выхавання маладога пакалення ў галіне мастацкай культуры, развіцця нацыянальнага мастацтвазнаўства, мастацка-творчага працэсу Р. Ф. Шаура дасягнуў высокіх рэзультатаў. Ажыццяўляючы пачэсную місію – навуковую, педагагічную і творчую, ён уносіць значны ўклад у выхаванне сучаснай моладзі і духоўнае адраджэнне нашай Радзімы.

*В. М. Ушакова,*
*доктар педагагічных навук, прафесар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ